# З ПЕРШАМАЙСКІМ СВЯТАМ, ТАВАРЫШЫ!

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

**ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

№ 16 (188) | Серада, 1 мая 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




***НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, ЗА МІР, ДЭМАКРАТЫЮ І САЦЫЯЛІЗМ!***

## ПАД СЦЯГАМ САЛІДАРНАСЦІ

**Б. В. БОКУЦЬ,**
**рэктар універсітэта, доктар фізіка-матэматычных навук.**

Над савецкай зямлёй, над усёй планетай высока лунаюць чырвоныя сцягі Першамая. Прыйшло да нас свята вясны, працы, міру, салідарнасці працоўных усяго свету. Мы сустрэлі яго з пачуццём вялікай радасці і гордасці за сваю любімую Радзіму, народ якой пад кіраўніцтвам Ленінскай Камуністычнай партыі паспяхова ажыццяўляе гістарычныя рашэнні XXIV з'езда КПСС па камуністычнаму будаўніцтву.

Выключным энтузіязмам напоўнены цяпер сэрцы савецкай моладзі, яе слаўнага авангарда — камсамола. Юнакі і дзяўчаты знаходзяцца пад уражаннем толькі што закончыўшага сваю работу XVII з'езда ВЛКСМ, яркай і глыбокай прамовы на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева.

Новы прыліў творчых сіл выклікала ў маладога пакалення актыўная падрыхтоўка да знамянальнай даты — 50-годдзя з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. Рапарты Камуністычнай партыі, Радзіме аб новых выдатных працоўных здзяйсненнях сведчаць аб тым, што савецкая моладзь дастойна працягвае слаўныя традыцыі сваіх бацькоў.

Сёлетні Першамай з'яўляецца для нашага ўніверсітэцкага калектыву, калі можна так сказаць, двайным святам. Сёння спаўняецца пяць гадоў з дня ўтварэння ГДУ. Гэты своеасаблівы юбілей вядучая вышэйшая навучальная ўстанова беларускага Палесся адзначае значнымі поспехамі ў сваім станаўленні. Універсітэцкі калектыў студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу прыкметна разросся, у поўным сэнсе слова ўзмацнеў.

У гэтым годзе мы атрымалі ў сваё распараджэнне выдатны вучэбна-лабараторны корпус, недалёка той час, калі будзе здадзен у эксплуатацыю новы інтэрнат кватэрнага тыпу. За прайшоўшы час непараўнальна палепшыліся ўмовы для падрыхтоўкі сапраўды высокакваліфікаваных спецыялістаў. Цяпер мы маем светлыя прасторныя аўдыторыі, добра аснашчаныя найноўшымі машынамі і прыборамі лабараторыі.

За папярэднія гады краіна атрымала ад нашага ўніверсітэта больш дзвюх тысяч спецыялістаў. Сёлета з дыпломамі ГДУ будуць накіраваны ў народную гаспадарку і на ніву асветы яшчэ 697 выпускнікоў. Першы атрад маладых спецыялістаў—108 чалавек—выпускае эканамічны факультэт.

Прыемна ўсведамляць тое, што на выпускнікоў нашага ўніверсітэта вялікі попыт. Іх запрашаюць на працу нават у самыя аддаленыя куткі нашай неабсяжнай краіны. У многія гарады Савецкага Саюза сёлета раз'едуцца, у прыватнасці, выпускнікі геалагічнага і эканамічнага факультэтаў.

Галоўны паказчык нашай працы, аб якім мы павінны рапартаваць на Першамайскім свяце — гэта паспяховасць студэнтаў. За апошні год яна якасна ўзрасла. Павялічылася колькасць круглых выдатнікаў і зменшылася троечнікаў. 88 лепшых студэнтаў універсітэта ўзнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатную вучобу».

Больш дзвюх трэціх нашых студэнтаў цяпер займаюцца ў навуковых гуртках. Навукова-даследчая работа садзейнічае паглыбленню іх ведаў, выклікае творчы падыход да справы. Пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў члены СНТ праводзяць сур'ёзныя навуковыя даследаванні, удзельнічаюць у выкананні гаспадарча-дагаворных тэм, у рацыяналізатарскай і вынаходніцкай рабоце.

Сёлета студэнты ўніверсітэта дабіліся значных поспехаў у V Усесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ, які прысвячаецца 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. Значна больш, чым у папярэднія гады, было адпраўлена работ на другі, рэспубліканскі тур гэтага конкурсу. Пераважная большасць навуковых даследаванняў нашых студэнтаў аднесена да першай і другой катэгорый.

Аднак гэтыя поспехі нас не могуць супакойваць. У справе падрыхтоўкі спецыялістаў, якія б поўнасцю адпавядалі патрабаванням часу, перад намі стаяць яшчэ вялікія задачы. Іх вырашэнне будзе ажыццяўляцца праз далейшае паглыбленне спецыялізацыі студэнтаў, удасканальванне вучэбнай і навукова-даследчай работы. Удасканальваюцца таксама вучэбныя праграмы. Істотным з'яўляецца тое, што будзе паглыбляцца вывучэнне спецыяльных дысцыплін, павялічвацца колькасць спецсемінараў. У нас адна мэта: трэба дабіцца таго, каб выпускнікамі ГДУ ганарыліся ў кожным працоўным калектыве. А гэта абавязвае працаваць яшчэ з большай настойлівасцю, стараннем і творчасцю.

Цвёрда ўпэўнены ў тым, што наш шматтысячны калектыў выкладчыкаў і студэнтаў паспяхова справіцца з вялікімі і адказнымі задачамі, якія пастаўлены партыяй і ўрадам перад вышэйшай школай. Ад імя рэктарата, парткома і ўсіх грамадскіх арганізацый ГДУ горача віншую вас, таварышы, з Першамайскім святам, жадаю выдатных поспехаў у вучобе, плённай працы і асабістага шчасця!

## ПРЫСВЕЧАНЫ ПЕРШАМАЮ

**Учора ў актавай зале ўніверсітэта адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны Першамайскаму святу. З дакладам аб Дні міжнароднай салідарнасці працоўных выступіў намеснік сакратара парткома, дацэнт кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму Я. А. Семянчук.**

**Для ўдзельнікаў урачыстага вечара быў паказан святочны канцэрт мастацкай самадзейнасці.**

## ДАВЕР'Е ПАРТЫІ АКРЫЛЯЕ

### НА XVII З'ЕЗДЗЕ ВЛКСМ

МАСКВА. (ТАСС). Дэлегаты знаходзяцца пад глыбокім, незабыўным уражаннем ад прамовы, сказанай на з'ездзе Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Л. І. Брэжневым. З пачуццём велізарнай гордасці ўспрынялі пасланцы камсамола высокую ацэнку, якую даў справам савецкай моладзі Леанід Ільіч. «Радзіма, партыя, — гаварыў Л. І. Брэжнеў, — верыць у маладое пакаленне. І жыццё паказвае: у любой справе на камсамол можна спадзявацца».

Акрылены давер'ем партыі, камсамол, усе юнакі і дзяўчаты краіны гатовы да выканання новых заданняў Радзімы. Эстафету Камсамольска, Магніткі, цаліны яны пранясуць па новых, яшчэ не асвоеных прасторах Сібіры, унясуць дастойны ўклад у далейшае развіццё сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны РСФСР.

Выступаўшыя на з'ездзе гаварылі аб многіх выдатных дасягненнях і пачынах камсамоліі.

6 тысяч камсамольска-маладзёжных брыгад, дзесяткі тысяч маладых работнікаў вытворчасці Масквы ўзялі на ўзбраенне метады барацьбы за найвышэйшую прадукцыйнасць працы, эканомію і беражлівасць, высокую якасць прадукцыі.

Пры самым непасрэдным удзеле ўкраінскіх камсамольцаў будуюцца буйнейшыя жывёлагадоўчыя комплексы, прадпрыемствы камбікармавой прамысловасці, вядзецца комплексная механізацыя дзеючых ферм.

Лепшых сваіх пасланцоў камсамольскія арганізацыі Ленінграда, дзе да канца пяцігодкі павінен быць наладжан серыйны выпуск трактара К-701, накіроўваюць на трактарную вытворчасць.

У словах дэлегатаў — рапарт партыі, рапарт любімай Радзіме. Прамоўцы падкрэслівалі, што ўсімі сваімі поспехамі, дасягненнямі, шчасцем камсамол абавязан партыі камуністаў.

Цёпла сустракалі дэлегаты з'езда зарубежных гасцей, якія выступалі з прывітаннямі ў адрас камсамола.

(Заканчэнне на 2-ой стар.)

## ДАВЕР'Е ПАРТЫІ АКРЫЛЯЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

24 красавіка ўся дэмакратычная і прагрэсіўная моладзь свету адзначала Міжнародны дзень салідарнасці. З трыбуны з'езда было заяўлена, што Ленінскі камсамол, выхаваны Камуністычнай партыяй на прынцыпах марксізму-ленінізму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, заўсёды ішоў і ідзе ў першых радах руху салідарнасці моладзі.

З'езд аднадушна прыняў Зварот да моладзі свету ў сувязі з Міжнародным днём салідарнасці моладзі.

25 красавіка дэлегаты з'езда працавалі па секцыях. Было ўтворана 12 секцый, дзе абмяркоўваліся праблемы фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду і працоўнага выхавання падрастаючага пакалення, удзелу моладзі ў інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, ваенна-патрыятычнага, эстэтычнага, фізічнага выхавання маладых людзей і іншыя пытанні.

* * *

26 красавіка скончылася абмеркаванне справаздачных дакладаў Цэнтральнага Камітэта і цэнтральнай рэвізійнай камісіі ВЛКСМ.

З заключным словам выступіў першы сакратар ЦК ВЛКСМ Я. М. Цяжэльнікаў.

Аднагалосна была прынята рэзалюцыя XVII з'езда ВЛКСМ па справаздачнаму дакладу Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ.

Была прынята пастанова аб частковых зменах у Статуце ВЛКСМ.

З'езд зацвердзіў справаздачу Цэнтральнай рэвізійнай камісіі ВЛКСМ.

Затым з'езд прыступіў да разгляду наступнага пункта парадку дня — выбараў цэнтральных органаў камсамола.

На вячэрнім пасяджэнні з'езд горача віталі прадстаўнікі замежных арганізацый моладзі.

27 красавіка адбылося ўрачыстае пасяджэнне XVII з'езда ВЛКСМ, прысвечанае 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

# Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

Мы, дэлегаты XVII з'езда Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, ад імя камсамольцаў, усёй савецкай моладзі звяртаемся да Цэнтральнага Камітэта КПСС са словамі сыноўняй любві і гарачай удзячнасці за ленінскія клопаты аб юным пакаленні краіны.

Акрыленыя мудрым і цёплым словам партыі, высокай ацэнкай дзейнасці Ленінскага камсамола, якая дадзена ў прывітанні ЦК КПСС XVII з'езду ВЛКСМ, у яркай глыбокай прамове таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева, камсамольцы, усе юнакі і дзяўчаты будуць з новай энергіяй выконваць задачы, пастаўленыя роднай партыяй.

У гэтыя красавіцкія дні мы зноў і зноў свае справы і думкі звяраем з запаветамі Леніна. Вучэнне марксізму-ленінізму, справа Леніна—неўміручыя. Яны жывуць і перамагаюць у гістарычных здзяйсненнях Камуністычнай партыі, савецкага народа.

Ленінскі камсамол, савецкая моладзь аднадушна адабраюць і непадзельна падтрымліваюць унутраную і знешнюю палітыку Камуністычнай партыі, нястомную дзейнасць Цэнтральнага Камітэта КПСС, яго Палітбюро, Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева па ажыццяўленню гістарычных рашэнняў XXIV з'езда партыі, па ажыццяўленню Праграмы міру.

У кіраўніцтве партыі, у яе велізарным і неацэнным вопыце — сіла Ленінскага камсамола. Дзякуючы штодзённай увазе і клопатам ЦК КПСС павышаецца роля і адказнасць ВЛКСМ як баявога рэзерва і надзейнага памочніка партыі ў будаўніцтве новага грамадства, у камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення.

Пяцьдзесят гадоў назад, на VI з'ездзе Расійскага Камуністычнага Саюза Моладзі, прымаючы імя Леніна, камсамол даў свяшчэнную клятву — заўсёды і ва ўсім няўхільна кіравацца ленінскімі запаветамі. Усе пакаленні камсамольцаў ратнымі і працоўнымі справамі даказалі вернасць гэтай урачыстай клятве.

Эстафета ўдарніцтва, якая стартавала на першых камуністычных суботніках, была пранесена праз Магнітку і Турксіб, падхоплена першапраходцамі цаліны, пакарыцелямі Ангары, нафтавікамі Цюмені, будаўнікамі КамАЗа — на ўсіх ударных камсамольскіх будоўлях. Гэту эстафету сёння прымаюць новыя тысячы камсамольцаў-добраахвотнікаў на трасе Байкала-Амурскай магістралі, на прасторах усёй нечарназёмнай зоны Расійскай Федэрацыі.

Камсамольцы 70-х гадоў — маладыя рабочыя і калгаснікі, спецыялісты і вучоныя, студэнты і навучэнцы, воіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту — сваёй настойлівай працай і вучобай сцвярджаюць ганаровае і адказнае права насіць імя Леніна.

Уся дзейнасць ВЛКСМ непарыўна звязана з агульнанароднай барацьбой за ажыццяўленне грандыёзных планаў камуністычнага будаўніцтва. На Зварот Цэнтральнага Камітэта КПСС да партыі, да савецкага народа—адзначыць чацвёрты, вызначальны год пяцігодкі новымі працоўнымі поспехамі— мільёны юнакоў і дзяўчат адказваюць самаадданай, сапраўды ўдарнай працай. Працаваць сёння і заўтра лепш, чым учора,—такі лозунг пяцігодкі, які стаў баявым дэвізам Ленінскага камсамола.

Камуністычная партыя паставіла перад камсамолам выключна важную задачу — па-баявому ўдзельнічаць у масавым руху за высокую якасць работы, за майстэрства, за гонар заводскай маркі.

Камсамольцы, юнакі і дзяўчаты будуць яшчэ больш актыўна праяўляць творчую ініцыятыву і смелы пачын, удасканальваць прафесіянальнае майстэрства, павышаць прадукцыйнасць працы, даваць прадукцыі больш, лепшай якасці, з меншымі затратамі, цвёрда трымаць курс на эканомію і ашчаднасць. Мы бачым свой абавязак у тым, каб яшчэ больш мэтанакіравана выхоўваць у моладзі камуністычныя адносіны да працы.

Ленінскі камсамол узмоцніць шэфства над прафесіянальна-тэхнічнай адукацыяй моладзі, акружыць клопатамі і пастаяннай увагай кожную навучальную ўстанову, дзе рыхтуецца маладое папаўненне рабочага класа і калгаснага сялянства.

Камсамольцы, юнакі і дзяўчаты будуць яшчэ глыбей авалодваць тэорыяй марксізму-ленінізму—самым перадавым рэвалюцыйным вучэннем сучаснасці. Наш высокі абавязак — пастаянна ўмацоўваць непарушную дружбу народаў СССР, выхоўваць у моладзі савецкі патрыятызм і сацыялістычны інтэрнацыяналізм, вернасць рэвалюцыйным, баявым і працоўным традыцыям партыі і народа, непрымірымасць да буржуазнай ідэалогіі. Мы бачым сваю задачу ў тым, каб яшчэ больш настойліва фарміраваць у кожнага маладога чалавека высокія маральныя якасці і эстэтычны густ, духоўную прыгажосць і фізічную дасканаласць, кавацьмужнасць, гатоўнасць да абароны вялікіх заваёў Кастрычніка.

Ленінскі камсамол будзе так будаваць сваю работу, каб моладзь пастаянна, настойліва і творча вучылася, папаўняла і паглыбляла свае веды, уносіла дастойны ўклад у паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Ленінскі камсамол будзе пастаянна ўдасканальваць кіраўніцтва піянерскай арганізацыяй, у цесным саюзе са школай, сям'ёй і грамадскасцю выхоўваць у піянераў, камсамольцаў-школьнікаў беззапаветную любоў да Радзімы, імкненне выдатна вучыцца, уменне працаваць, паважаць працу.

Камсамол, верны пралетарскаму інтэрнацыяналізму, нястомна ўмацоўвае брацкую дружбу з моладдзю краін сацыялістычнай садружнасці.

Мы памножым свае намаганні ў барацьбе за згуртаванне міжнароднага маладзёжнага камуністычнага і дэмакратычнага руху. Нашы сэрца з гераічным народам В'етнама, які адстаяў сваю свабоду, з патрыётамі і дэмакратамі Чылі, якія вядуць мужную барацьбу супраць фашысцкага тэрору, з моладдзю арабскіх краін, якая змагаецца за справядлівы і трывалы мір на Блізкім Усходзе. Савецкі камсамол заўсёды будзе з тымі, хто змагаецца супраць імперыялізму, за нацыянальную незалежнасць і сацыяльны прагрэс, за мір, лепшае будучае моладзі.

Мы будзем і надалей умацоўваць Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, удасканальваць дзейнасць камсамольскіх арганізацый, умацоўваць дысцыпліну і арганізаванасць нашых радоў, выхоўваць кожнага камсамольца ў духу высокай адказнасці за прыналежнасць да перадавога атрада савецкай моладзі. Мы будзем дабівацца, каб кожны камітэт камсамола стаў сапраўдным арганізатарам моладзі ў працы, вучобе і адпачынку.

XVII з'езд ВЛКСМ урачыста запэўнівае Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, што Ленінскі камсамол яшчэ цясней згуртуе свае рады вакол роднай партыі, пад яе мудрым кіраўніцтвам будзе высока і горда несці імя Леніна, вучыцца, працаваць і змагацца па-ленінску ў імя камунізму.

Няхай жыве вялікая Камуністычная партыя Савецкага Саюза і яе ленінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве наша любімая Радзіма — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

УДАСТОЕНАЯ ЎРАДАВАЙ УЗНАГАРОДЫ

# ШЧАСЦЕ СТУДЭНТКІ



Майскія вясновыя дні заўсёды прыносяць у Надзіну душу ажыўленне і бадзёрасць. Яе радуе ўсё: і цёплыя позіркі сонца, і зялёная траўка, і несціханыя песні першых вестуноў вясны.

Сёлетні Першамай для Надзі Колтышавай — асаблівы, адметны. Надзя прыгадала сваю маці. Як будзе яна ганарыцца, калі ўбачыць на грудзях у дачкі бліскучы медаль «За працоўную адзнаку». Калі яшчэ Надзя працавала пасля школы на Светлагорскім заводзе штучнага валакна, маці заўсёды радавалася поспехам сваёй дачкі.

У вольныя пасля працы мінуты Надзя шмат чытала. Гэтае захапленне перарасло ў любоў да гісторыі свайго народа, сваёй Радзімы і нараджалася мара: вывучаць далей любімую дысцыпліну ў вышэйшай навучальнай установе.

Праз тры гады працы на заводзе Колтышаву накіроўваюць на падрыхтоўчае аддзяленне нашага ўніверсітэта. Тут Надзя праявіла сябе як у вучобе, так і ў працы. Летам па камсамольскай пуцёўцы яна едзе са студэнцкім будаўнічым атрадам «Прыпяць-70» у Хойніцкі раён.

...«Палессе-71» (Жлобінскі раён), «Эканаміст-72» (Казахская ССР), «Атлант-73» (Жлобінскі раён) — гэта наступныя працоўныя этапы энтузіясткі, рамантыка.

З'яўляючыся ў атрадзе простым байцом ці поварам, Надзя праяўляла вялікую актыўнасць у грамадскім жыцці. Без яе ўдзелу не праходзіла ні адно цікавае і карыснае мерапрыемства. У будаўнічых атрадах яна дапамагала выпускаць насценныя газеты, прымала ўдзел у мастацкай самадзейнасці і рабоце піянерскага лагера-спадарожніка.

Камандзір атрада «Атлант-73» М. Байко ўспамінае: «З Надзяю ў працы не маглі зраўняцца нават некаторыя дужыя хлопцы. Там, дзе яна з'яўляецца, паднімаецца настрой, бадзёрасць і знікае сум».

Вялікую грамадскую работу Надзея Колтышава вядзе на сваім факультэце. Цяпер яна з'яўляецца намеснікам старшыні прафкома ўніверсітэта.

Урад высока ацаніў працоўную дзейнасць у будаўнічых атрадах студэнткі чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Надзеі Іванаўны Колтышавай. За актыўны ўдзел у выкананні народнагаспадарчых планаў трэцяга, рашаючага года дзевятай пяцігодкі, выдатную вучобу і вялікую грамадскую работу яна ўзнагароджана медалем «За працоўную адзнаку».

А. ЛОЗКА.

□

На гэтым здымку вы бачыце (злева направа): Валерыя Дзедава з фізічнага факультэта, Уладзіміра Самсонава — з біёлага-глебавага, Уладзіміра Коваля — з гісторыка- філалагічнага, будучага фізіка Аляксандра Галіцкага. Сёння ва ўсіх іх прыўзняты настрой. Яны — выпускнікі ўніверсітэта. Недалёка той час, калі хлопцы з дыпломамі аб вышэйшай адукацыі стануць на працоўны шлях. Старанная вучоба, актыўны ўдзел у студэнцкай навукова-даследчай рабоце далі ім глыбокія і трывалыя веды па выбранай спецыяльнасці.

Фота А. Рудчанкі.



# 5-га мая—Дзень друку

**«...ГАЗЕТА НЕ ТОЛЬКІ КАЛЕКТЫЎНЫ ПРАПАГАНДЫСТ І АГІТАТАР, АЛЕ І КАЛЕКТЫЎНЫ АРГАНІЗАТАР».**

**У. І. ЛЕНІН.**

Праз чатыры дні ўся наша краіна будзе адзначаць свята работнікаў друку. Гэта свята не толькі прафесійных журналістаў, але і верных іх памочнікаў — рабселькораў, шматмільённай арміі чытачоў.

Створаны вялікім Леніным, бальшавіцкі друк вырас у магутную ідэйную зброю, стаў сапраўды ўсенароднай трыбунай, важнейшым сродкам выхавання мас, іх арганізацыі на паспяховае выкананне грандыёзных планаў камуністычнага будаўніцтва. Сёння кожны з нас не можа ўявіць жыцця без газет, часопісаў. Па іх выданню Савецкі Саюз займае першае месца ў свеце.

## МАГУТНАЯ ЗБРОЯ

Хутка споўніцца пяць гадоў, як выпускаецца наша шматтыражная газета «Гомельскі ўніверсітэт». З'яўляючыся органам парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта камсамола і прафкома, яна садзейнічае паспяховаму выкананню ўсіх задач, якія стаяць перад універсітэтам у справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, а таксама перад партыйнай, прафсаюзнай, камсамольскай і іншымі грамадскімі арганізацыямі.

Праз газету вучоныя і выкладчыкі вядуць размову са студэнтамі па самых актуальных пытаннях, на яе старонках пачынаюць шлях у вялікую паэзію маладыя аўтары, якія згуртаваліся ва ўніверсітэцкім літаратурным аб'яднанні. «Гомельскі ўніверсітэт» з'яўляецца актыўным прапагандыстам фізічнай культуры і спорту, новага комплексу ГПА.

Супрацоўнікам рэдакцыі вельмі прыемна, што ўніверсітэцкая шматтыражка карыстаецца ў чытачоў усё больш узрастаючым аўтарытэтам. І гэта таму, што няўхільна павялічваецца кола яе аўтараў, з уважлівасцю да сваёй газеты адносяцца партком, рэктарат і іншыя грамадскія арганізацыі.

Сёння ўжо немагчыма пералічыць усіх тых, хто за гады існавання «Гомельскага ўніверсітэта» дасылаў для публікацыі ў ім свае матэрыялы. Вельмі многія, удзельнічаючы ў яго выпуску, адчулі жыццёвую неабходнасць быць у пастаянным кантакце з друкаваным органам, сталі сапраўднымі сябрамі газеты. Зараз хочацца назваць прозвішчы тых, хто на працягу ўсёй вучобы ва ўніверсітэце не парывае сувязі з нашай шматтыражкай, рэгулярна рыхтуе для яе матэрыялы. Гэта — сёлетні выпускнік гісторыка-філалагічнага факультэта У. Багамольнікаў, Анатоль Зэкаў, Уладзімір Лапіцкі, Пятро Раманенка і іншыя студэнты. Часта пішуць нам матэрыялы старшыня мясцкома Ф. Ф. Ганчэль, старшыня камітэта ДТСААФ П. У. Жукаў, кандыдат медыцынскіх навук В. П. Дзядзічкін, выкладчык кафедры рускай літаратуры Р. Літвінаў, прафесар А. С. Калугін і іншыя.

Мы асабліва ўдзячны студэнтам эканамічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў, якія з'яўляюцца нашымі пастаяннымі і самымі актыўнымі аўтарамі. Хочацца, каб з іх бралі прыклад студэнты ўсіх факультэтаў. Гэта дазволіць нам рабіць газету яшчэ больш цікавай і змястоўнай.

Горача віншуем вас, нашы верныя сябры, з Першамайскім святам і наступаючым Днём друку! Няхай ніколі не ломяцца вашы пёры і заўжды спадарожнічае вам творчы плённы настрой!



**Наша шматтыражная газета крыху маладзейшая за ўніверсітэт. Яе пяцігадовы юбілей — праз чатыры месяцы. Але, калі можна так сказаць, яна таксама прыкметна пасталела, пашырыла кола сваіх актыўных аўтараў. Цяпер у газеты шмат сяброў. Яны жыва цікавяцца ўсім тым, аб чым паведамляецца на яе старонках.**

**Наш фотакарэспандэнт Анатоль Рудчанка зрабіў гэты фотаздымак у дзень Камуністычнага суботніка. Студэнты групы Б-13 гісторыка-філалагічнага факультэта выкраілі мінутку, каб даведацца аб тым, пра што піша ўніверсітэцкая шматтыражка.**



**На гэтым здымку вы бачыце студэнта чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Аляксандра Касалапава. Фотасправай ён пачаў займацца ў школьныя гады. Вялікая практыка дазволіла яму добра авалодаць фотатэхнікай, выпрацаваць эстэтычны густ, без якога не можа абысціся чалавек з камерай.**

**Фотаздымкі Аляксандра Касалапава часта змяшчаліся на старонках нашай шматтыражнай газеты. Ён — актыўны ўдзельнік усіх фотаконкурсаў «Гомельскага ўніверсітэта», двойчы быў іх прызёрам.**

**Аляксандр — добры сябра і памочнік нашай газеты.**

## ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Самым масавым у нашай краіне з'яўляецца насценны друк. Партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі яму таксама надаецца вялікая роля, як зручнаму і даступнаму сродку інфармацыі, агітацыі і прапаганды. У гэтым сэнсе можна спаслацца на прыклад і нашага ўніверсітэта. Насценныя газеты выпускаюцца на кожным факультэце. Рэдкалегіі ў меру сваіх магчымасцей імкнуцца шырока асвятляць студэнцкае жыццё, аказваюць неператаэнную дапамогу ў падрыхтоўцы і выхаванні маладых спецыялістаў.

Акрамя агульнафакультэцкіх, выпускаюцца таксама курсавыя насценгазеты, сатырычныя дадаткі, кафедральныя бюлетэні і іншыя віды насценнага друку.

Для павышэння ідэйна-тэматычнага зместу і паляпшэння афармлення насценных газет мясцком і рэдакцыя шматтыражнай газеты «Гомельскі ўніверсітэт» штогод праводзяць іх агляд-конкурс, вынікі якога падводзяцца да Дня друку.

Сёлета гэты конкурс прысвячаецца 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна і 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аналізуючы стан насценнага друку, перш за ўсё хочацца адзначыць іх узрослую баявітасць. Больш канкрэтнымі, набліжанымі да студэнцкага жыцця сталі змяшчаемыя матэрыялы. Больш прываблівым стаў знешні выгляд насценгазет.

Самага добрага слова падзякі заслугоўваюць дэканат, партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі эканамічнага факультэта. Яны па-сапраўднаму цэняць насценны друк і адносяцца да яго з належнай увагай і прынцыповасцю. Насценная газета «Эканаміст» (рэдактар Я. Абраменка) сёння можа служыць узорам для кожнага факультэта. Па-першае, яна выгадна вызначаецца выключна маляўнічым, глыбока прадуманым мастацкім афармленнем, па-другое, і гэта галоўнае, шматгранна і глыбока адлюстроўвае ўсе бакі факультэцкага жыцця. Вельмі цікавым і баявым выходзіць сатырыка-гумарыстычны дадатак да газеты — «ЭВМ» (элексір вясёлых мінут).

Насценнаму друку эканамічнага факультэта рашэннем конкурснай камісіі аднадушна прысуджана першае месца.

Поспехам у чытачоў карыстаецца і насценная газета «Архімед» (рэдактар Л. Мароз) фізічнага факультэта. Гэта таксама не выпадкова. У яе калонках змяшчаюцца матэрыялы, якія выклікаюць жывую цікавасць чытачоў, нярэдка хвалююць іх. Нядрэнна і афармляецца «Архімед». Гэтай насценгазеце прысуджана другое месца.

Вялікія магчымасці для выпуску насценнай газеты ў студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта. Аднак рэалізуюцца яны не поўнасцю. Таму іх насценгазета «Праметэй» (рэдактар Л. Вышэўская) у сёлетнім конкурсе заняла толькі трэцяе месца.

Рэдкалегіі лепшых насценгазет будуць заахвочаны. Можна было яшчэ гаварыць пра насценныя газеты іншых факультэтаў. Але гэтага мы не робім спецыяльна. І вось чаму. У фае корпуса № 1 універсітэта арганізавана выстаўка насценгазет, прысвечаная Дню друку. І мы хочам, каб як мага больш на яе прыйшло студэнтаў, выкладчыкаў. Яны самі здолеюць даць ацэнку нашаму насценнаму друку.

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## НА СПАРТАКІЯДЗЕ «ДРУЖБЫ»

У нашым горадзе праведзены спаборніцтвы па плаванню па праграме спартакіяды «Дружба», у якой удзельнічаюць мацнейшыя спартсмены трох суседніх абласцей — Гомельскай, Чарнігаўскай і Бранскай. На блакітных дарожках паспяхова стартавала прызёр міжнародных спаборніцтваў на прыз газеты «Комсомольская правда» студэнтка нашага ўніверсітэта Надзея Болатава. Яна была мацнейшай у заплывах жанчын на 100 і 200 м вольным стылем.

## І РЭКОРД, І ЗАПАВЕТНЫ НАРМАТЫЎ

У Гродна праведзены спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы, якія ўваходзяць у праграму спартакіяды вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. За ўзнагароды змагаліся мацнейшыя спартсмены студэнцкага таварыства, сярод якіх было 14 майстроў спорту і 12 кандыдатаў у майстры.

У паўлёгкай вагавай катэгорыі сюрпрыз прыпаднёс студэнт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта С. Вартанян. Штурхнуўшы штангу 163 кг, ён устанавіў рэспубліканскі рэкорд ДСТ «Буравеснік» і выканаў нарматыў майстра спорту СССР.

Вызначыўся і студэнт ГДУ А. Шатаў. Ён стаў чэмпіёнам у найлягчэйшай вазе, паказаўшы ў суме двухбор'я 167,5 кг.

У камандным заліку цяжкаатлеты ГДУ былі трэцімі.

*Паэтычная калонка*

## ЗНАЁМЦЕСЯ: Ірына Багдановіч



**Ірына прызнаецца, што пачала пісаць вершы, як толькі навучылася трымаць у руцэ пяро.**

**Яшчэ будучы школьніцай, юная паэтэса стала актыўным членам літаратурнага аб'яднання «Рунь» пры абласной газеце «Гомельская праўда». Пра Ірыну гавораць, як пра здольнага маладога аўтара.**

**Вялікія магчымасці і шырокія гарызонты адкрыліся перад Багдановіч у нашым універсітэце, дзе яна вучыцца з мінулага года на рускім аддзяленні гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**Ірына піша вершы на беларускай і рускай мовах. Чатыры з іх мы выносім на суд чытачоў.**

□

### МОЙ КУТ

Гэта ўсё маё роднае тут.
Сустракаю, вітаю здаля
І атулены вішнямі кут,
І трымценне старога галля,
І духмянага хлеба той пах,
І бабульку маю ля пячы,
І прамень задумення ў вачах,
І далоні твае на плячы.

### ЧАКАННЕ

Пра чаканне спяваюць рэчкі,
Да цябе што імчацца хутка.
Зноў чакаю з табой сустрэчы
Ля бярозкі ля нашай гнуткай.
Ты далёка цяпер, далёка.
А ў нас ўжо вясна спявае.
І чакаю твае я крокі,
І ўсмешку тваю чакаю.
Ты на нашай сцяжынцы вузкай
Зноў аднойчы назнач спатканне.
Берагу для цябе я вусны,
Толькі й ты беражы каханне.

### ВЕСНА

А весна рождается из речки,
Захрустев податливым ледком,
А весна рождается из встречи
На заветной тропке
за холмом.
Треплет ветер волосы
девчонке
И в ручье дурачится, звеня.
А весна курлычет
журавлёнком
В синеве проснувшегося дня.

* * *

Меня качали ветры
в колыбели,
А молоком вскормила
мать-земля.
Весной с небёс мне жаворонки
пели,
В жару стелили тени тополя.
В зелёной роще мненазавещала
Кукушка щедро жизни на сто
лет.
На радость мне ромашка
расцветала,
На счастье разгорался горицвет.
Мне дали силу чистые криницы,
Капели—звонкий голос по весне.
Но как за всё смогу
я расплатиться:
За радость, за печаль, за боль,
за гнев,
За две берёзы с памятью
о встрече,
За озорной черемуховый май?
Мне этот долг покрыть,
пожалуй, нечем...
Лишь только в сердце песен
через край.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 04262 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш, Фармат 300×420 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 3052